# Фарміраванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі (кастрычнік 1917 г. – ліпень 1920 г.)

1. Размежаванне палітычных сіл у Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

2. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).

3. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) і Літоўска-Беларускай ССР. Другое абвяшчэнне БССР

Пад уплывам Кастрычніцкай рэвалюцыі **беларускі нацыянальны рух** падзяліўся на **дзве часткі**. Адна падтрымлівала рэвалюцыю, другая выступала супраць. ***2 лістапада 1917 г.*** была апублікавана **Дэкларацыя правоў народаў Расіі**. У ёй абвяшчалася раўнапраўе ўсіх народаў, іх права на самавызначэнне. Гэта змяніла пазіцыю беларускіх нацыянальных сіл, якія павялі барацьбу за стварэнне беларускай дзяржаўнасці. Ажыцця-віць гэту ідэю паспрабавалі прадстаўнікі беларускіх нацыянальных арганізацый: **Вялікай беларускай рады** (выступала за незалежную дзяржаву) і **Беларускага абласнога камітэта** (выступаў за аўтаномію ў складзе Расіі) у ***снежні 1917 г.*** на **І Усебеларускім з'ездзе,** які праходзіў ***з 5 да 18 (18 – 31) снежня 1917 г.*** у Мінску

**З’езд адкрыўся *15 снежня 1917 г.*** Для яго работы быў выбраны кіруючы орган – **Рада старэйшын з’езда**. На з’едзе прысутнічалі 1872 дэлегаты. У ноч ***з 17 на 18 снежня 1917 г.*** быў аб’яўлены праект агульнай рэзалюцыі з’езда **“Аб самавызначэнні Беларусі і аб часовай краявой уладзе”**. Дэлегаты з’езда паспелі прыняць толькі першы пункт рэзалюцыі аб увядзенні ў межах беларускай зямлі **рэспубліканскага ладу** на чале з **Усебеларускім Саветам сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў,** які меркавалася вылучыць са свайго складу. З’езд не прызнаў легітымнасць бальшавіцкай улады

Гэта рашэнне з’езда СНК Заходняй вобласці і фронту расцаніў як контррэвалюцыйную спробу звяржэння савецкага ладу. Таму **ноччу *18 снежня*** з’езд быў разагнаны, прэзідыум і шэраг дэлегатаў арыштаваны (усяго 27 чалавек). Пасля разгону з’езда Рада старэйшын аб’явіла сябе **Радай з’езда**. На сваім першым канспіратыўным пасяджэнні ***18 снежня 1917 г.*** Рада з’езда пастанавіла прызнаць за сабой ролю выканаўчага органа з’езда. Быў створаны **выканкам Рады** ў складзе 17 чалавек на чале з **Я. Варонкам**

***2 снежня 1917 г.*** паміж Савецкай Расіяй і Германіяй было **падпісана перамір’е**, а ***9 снежня*** – у Брэст-Літоўску пачаліся мірныя перамовы, якія былі сарваны прадстаўнікамі Расіі. У выніку ***18 лютага 1918 г.*** германскія войскі пачалі наступленне па ўсяму фронту і былі спынены ў ***пачатку сакавіка 1918 г.*** на лініі **Полацк – Орша – Магілёў – Гомель**. У такіх умовах кіраўніцтва Аблвыканкамзаха і абласнога СНК вымушана было ў ноч ***з 19 на 20 лютага 1918 г.*** эвакуіравацца з Мінска ў Смаленск



Народны сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі. Злева направа: сядзяць — А. Бурбіс, Я. Серада, Я. Варонка, В. Захарка; стаяць — А. Смоліч, П. Крачэўскі, К. Езавітаў, А. Аўсянік, Л. Заяц. Мінск. 1918 г.

та ваканкам

з’езда ***21***

***1918 г.*** звярнуўся да

русі з **1-й**

у якой аб’явіў

й у краі. Урадам стаў

**ыят** на чале з **Я.**

**Варонкам**. У яго склад ўвайшло 15 народных сакратароў. Аднак ва ўмовах акупацыі рэальнай улады Народны Сакратарыят не атрымаў і працягваў сваё існаванне толькі фармальна



Мірныя перагаворы ў Брэсце. Сакавік 1918 г.

***а 1918 г***. паміж
р- маніяй быў
сепаратны **мірны дага-**
ных Гер- маніяй
дагаворам, землі
-Заходняй Беларусі
іі. Усходняя частка
й беларускіх зямель
заставалася пад акупацыяй да выплаты Расіяй 6-мільярднай кантрыбуцыі. Савецкая Расія прызнавала незалежнасць Украінскай Народнай Рэспублікі і яе права на Брэсцкі, Пінскі, Мазырскі, Рэчыцкі і Гомельскі паветы. Германія абавязвалася не прызнаваць на тэрыторыі былой Расійскай імперыі ніякіх новых дзяржаў, абвешчаных пасля ***3 сакавіка***, г. зн. і беларускай

Заключэнне ***3 сакавіка 1918 г.*** **Брэсцкага міра** без уліку інтарэсаў беларускага народа паскорыла працэс палітычнага самавызначэння Беларусі***. 9 сакавіка 1918 г.*** была прынята **Другая Устаўная грамата**, якая абвясціла **ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР)**. У ёй былі дэклараваныя дэмакратычныя свабоды, адмена прыватнай уласнасці на зямлю, якая павінна была перадавацца без выкупу тым, хто яе апрацоўвае. ***25 сакавіка 1918 г.*** была прынята **Трэцяя Устаўная грамата**, абвясціўшая **незалежнасць БНР**

***25 красавіка 1918 г.*** па ініцыятыве лідэра правых сіл ***Р. Скірмунта*** Рада БНР адправіла імператару Германіі ***Вільгельму II тэлеграму*** з падзякай “за вызваленне Беларусі ад бальшавіцкага прыгнёту і анархіі” і просьбай дапамагчы ва ўмацаванні дзяржаўнай незалежнасці і непадзельнасці краю ў саюзе з Германіяй. Гэта выклікала крызіс урада БНР і **раскол БСГ**.

Германія дэ-юрэ не прызнала незалежнасці БНР, аднак акупацыйныя ўлады прадставілі ёй некаторыя паўнамоцтвы ў сферы гандлю, адукацыі, сацыяльнага забеспячэння і інш.

Пасля капітуляцыі Германіі ***11 лістапада 1918 г.*** Чырвоная Армія перайшла ў наступленне і ўрад БНР быў вымушаны эміграваць

Такім чынам, БНР не з’яўлялася дзяржавай у поўным сэнсе слова. На акупіраванай тэрыторыі Беларусі фактычна ўсе пытанні дзяржаўнага ўзроўню вырашаліся не Радай і Народным Сакратарыятам БНР, а германскай ваеннай адміністрацыяй. БНР не здзяйсняла свае паўнамоцтвы на ўсёй тэрыторыі пражывання беларусаў, не мела ўласнай арміі, органаў улады на месцах, фінансавай і судовай сістэм. Яна не атрымала належнага міжнароднага прызнання. Функцыі ўрада БНР абмяжоўваліся палавінчатымі паўнамоцтвамі нацыянальнага прадстаўніцтва пры германскай акупацыйнай адміністрацыі і рашэннем пад кантролем немцаў задач у галіне культуры і адукацыі. Таму **адносна БНР можна гаварыць толькі аб спробе стварэння беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці на буржуазнай аснове**

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў зноў паўстала пытанне аб утварэнні беларускай дзяржаўнасці. Але па ім не было адзінай думкі. Існавала **некалькі пазіцый**: **1) Паўночна-Заходняга абкома РКП(б).** Яго кіраўнікі **А. Мяснікоў, В.Кнорын** і іншыя лічылі, што Беларусь павінна быць тэрытарыяльнай адзінкай у складзе РСФСР на той падставе, што беларусы не з’яўляюцца нацыяй; **2) Беларускага нацыянальнага камісарыята, утворанага 31 студзеня 1918 г. пры камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР.** Кіраўнікі Белнацкама **А.Чарвякоў, З.Жылуновіч** і іншыя лічылі неабходным стварыць Беларускую Савецкую Рэспубліку і ўстанавіць цесныя сувязі з Расіяй (**на прынцыпах аўтаноміі**). Гэтую пазіцыю падтрымлівала **Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б)** у Расіі

Доўгі час гэтае пытанне не вырашалася. І толькі ***24 снежня 1918 г.*** **Пленум ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб утварэнні БССР**.

***30 снежня 1918 г.*** **на VI Паўночна-Заходняй партыйнай канферэнцыі РКП(б), якая абвясціла сябе I з'ездам КП(б)Б**, **была прынята рэзалюцыя "Аб абвяшчэнні Заходняй Камуны Беларускай Савецкай Рэспублікай"**.

***31 снежня 1918 г.*** **быў створаны Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад Беларусі** на чале з **З.Жылуновічам**.

***1 студзеня 1919 г.*** Часовы ўрад абвясціў **Маніфест аб стварэнні БССР**

***16 студзеня 1919 г.*** **ЦК РКП(б) прыняў рашэнне, дзе прапаноўвалася вылучыць са складу БССР Смаленскую, Магілёўскую і Віцебскую губерні і далучыць іх да РСФСР, а Мінскую і Гродзенскую губерні аб'яднаць з Літоўскай Савецкай Рэспублікай.** ***2 – 3 лютага 1919 г.*** **у Мінску адбыўся І Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў**. З'езд прыняў наступныя дэкларацыі: да ўсіх народаў і іх урадаў, дзе заклікаў прызнаць незалежнасць БССР і ўстанавіць з ёю дыпламатычныя адносіны; аб устанаўленні федэратыўных сувязей з РСФСР; аб аб'яднанні БССР і ЛітССР у адну дзяржаву - Літоўска-Беларускую ССР (Літбел). **З'езд прыняў Канстытуцыю БССР.** Па ёй найвышэйшая ўлада ў рэспубліцы належала **з'езду Саветаў**. Паміж з' ездамі яе здзяйсняў **Цэнтральны выканаўчы камітэт** (старшыня – **А. Мяснікоў**). Функцыі ўрада БССР належалі **Вялікаму прэзідыуму ЦВК** рэспублікі ў складзе 15 народных камісараў

***27 лютага 1919 г.*** **былі створаны ЦВК Літ-БелССР і яго прэзідыум на чале з К. Цыхоўскім, урад аб'яднанай рэспублікі – СНК на чале з В. Міцкявічусам-Капсукасам**. У склад ЛітБел увайшла тэрыторыя Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і частка Сувалкаўскай губерняў з больш як 4-мільённым насельніцтвам. ***4 – 6 сакавіка 1919 г.*** **прайшоў аб'яднальны з'езд кампартый Літвы і Беларусі.** ***6 сакавіка*** **Пленум ЦК КП(б)ЛіБ стварыў прэзідыум ЦК КП(б)ЛіБ**. Старшынёй прэзідыума быў выбраны В. Міцкявічус-Капсукас, сакратаром В. Кнорын. Сталіцай аб' яднанай дзяржавы стаў г. Вільня. ЛітБел праіснавала ***да ліпеня 1920 г.***

У ***лістападзе 1918 г.*** адрадзілася Польская дзяржава. Яе кіраўніцтва на чале з ***Ю. Пілсудскім*** аб’явіла аб адраджэнні Рэчы Паспалітай у межах ***1772 г.*** У ***пачатку лютага 1919 г.*** польская армія пачала наступленне на ўсход.

Савецка-польская вайна працягвалася з пераменным поспехам да ***восені 1920 г***. Яна скончылася **Рыжскім мірным дагаворам**, які быў падпісаны ***18 сакавіка 1921 г.*** паміж РСФСР, УССР, з аднаго боку, і Польшчай – з другога. Прадстаўнікам БССР не далі магчымасці прыняць непасрэдны ўдзел у перагаворах. Дагавор замацаваў падзел тэрыторыі Беларусі, бо да Польшчы адыходзіла заходняя яе частка

Пасля выгнання польскіх войск ***11 ліпеня 1920 г.*** з Мінска, а затым і большай часткі тэрыторыі Беларусі склаліся аб'ектыўныя перадумовы для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці.

Ваенрэўком БССР, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі КП(б)Б, БКА, Бунда і Цэнтральнага Бюро прафсаюзаў Мінска, выдаў ***31 ліпеня 1920 г.*** "**Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі**".

Як суверэнная дзяржава ССРБ функцыянавала пасля другога абвяшчэння толькі ў межах 6 паветаў былой Мінскай губерні. Яе плошча складала 52,4 тыс. км$^2$, а насельніцтва – 1544 тыс. чалавек. ЦВК і СНК ССРБ узначаліў ***А. Чарвякоў***

Такім чынам, у ***1917 – 1920 гг.*** супрацьстаялі розныя мадэлі беларускай дзяржаўнасці. БНР стала першай нацыянальнай формай беларускай дзяржаўнасці, створанай на **буржуазнай** аснове. У ёй была ўтворана пэўная палітычная структура з зародкамі дзяржаўнай арганізацыі. Аднак у прамым сэнсе БНР дзяржавай не была. Перамагла **савецкая** мадэль беларускай дзяржаўнасці, але першапачаткова беларускія тэрыторыі былі падзелены паміж Польшчай і Савецкай Расіяй